# ВЫХАВАННЕ ДУХОЎНА-МАРАЛЬНАЙ АСОБЫ ВУЧНЯ СРОДКАМІ ЭТНАКУЛЬТУРНЫХ ТРАДЫЦЫЙ



**Бегічэва Анжэла Леанідаўна,**
*настаўнік музыкі вышэйшай катэгорыі ДУА "Сярэдняя школа № 5 г. Наваполацка"*

## ПРАЗ ЭТНАПЕДАГОГІКУ ДА АСОБЫ ВУЧНЯ

*У артыкуле разглядаюцца асноўныя напрамкі работы па фарміраванні ў навучэнцаў этнічнай самасвядомасці, цікавасці да нацыянальнай культуры і традыцый.*

**Уводзіны.** Кожнае дзіця, ледзь з'явіўшыся на свет, патрабуе да сябе асаблівай увагі, задавальнення яго фізічных патрэбаў. Але не менш важным з'яўляецца эмацыйны аспект яго развіцця і выхавання.

Спакон веку пяшчотная калыханка, вясёлыя пацешкі, вячэрнія казкі, выражэнне любові і радасці ў адносінах да малога служаць залогам фарміравання ў будучыні паўнавартаснай асобы, здольнай да ўспрымання прыгожага і да самастойнасці ў творчасці. Лічыцца, што ўсе дзеці таленавітыя. Трэба толькі ўбачыць у кожным дзіцяці пэўны патэнцыял (будзь гэта схільнасць да музыкі, малявання, танцаў і т.п.) і пастарацца максімальна яго развіць. Для чаго?

Наша краіна, наш народ, як і ўсе іншыя краіны і народы, маюць патрэбу ў таленавітых людзях. Так, інтэлігентны чалавек з развітым эстэтычным густам, працуючы ў любой галіне, прынясе значна больш карысці сваёй краіне, свядома імкнучыся да прыгажосці і творча падыходзячы да любой справы. Аднак далёка не кожная сям'я мае магчымасць навучаць сваё дзіця ў дзіцячых школах мастацтваў. Але большасць дзяцей цягнецца да музыкі, танца, прыкладнога мастацтва. І тут прысутнічае вялікая роля ўстановы адукацыі як самага даступнага і рознабаковага фактару далучэння дзяцей да прыгожага.

З даўніх часоў перад педагогамі і бацькамі стаяла задача, як выхаваць дзяцей, каб яны былі апорай у будучыні, неслі ў сабе тое станоўчае, што выпрацавана і апрабавана. Таксама згодна з прыярытэтам Нацыянальнай дактрыны адукацыі сістэма адукацыі заклікана забяспечыць: гістарычную пераемнасць пакаленняў, захаванне, распаўсюджванне і развіццё нацыянальнай культуры, выхаванне беражлівых адносін да гістарычнай і культурнай спадчыны Беларусі. І цяпер, калі так актыўна развіваюцца сацыяльныя працэсы, асабліва вылучаецца паслабленне такіх найважнейшых якасцяў, як маральнасць, духоўнасць і культура. Педагагічную дзейнасць тут мэтазгодна разглядаць праз прызму этнапедагогікі.

**Асноўная частка.** У цяперашні час актуальным напрамкам выхавання ў адукацыйнай сферы з'яўляецца фарміраванне ў навучэнцаў этнічнай самасвядомасці, цікавасці да нацыянальнай культуры і традыцый. Этнакультурная кампетэнтнасць – гэта не проста прадстаўленне аб гісторыі і культуры іншых нацый і народнасцяў, гэта прызнанне этнакультурнай разнастайнасці нормай, абумоўленай самой прыродай чалавечага быцця. Сацыялізацыя навучэнцаў, як вядома, характарызуецца інтэнсіўным уваходжаннем у навакольны свет, фарміраваннем пачатковых уяўленняў пра сябе і грамадства, пачуццямі і дапытлівасцю. З улікам гэтага можна зрабіць выснову аб спрыяльных перспектывах і актуальнасці фарміравання ў дзяцей маральнасці і духоўнасці з дапамогай этнакультурных традыцый выхавання.

Этнапедагогіка на дадзены момант апынулася ў крытычным становішчы, так як аснова для вывучэння народных традыцый як галоўнага яе выхаваўчага сродку ў сучасным гра-

мадстве па большай частцы страчаная. Таму ў этнакультурным выхаванні асноўнымі тэхналагічнымі сродкамі педагагічнага ўзаемадзеяння педагога і выхаванцаў з'яўляюцца сумеснае пражыванне, тэатралізацыя, прайграванне народных традыцый. Выкарыстанне ўсяго гэтага ў выхаванні падрастаючага пакалення ёсць сталая і плённая традыцыя.

Народная культура з'яўляецца захавальніцай векавых традыцый, вопыту, самасвядомасці нацыі, а таксама выразам філасофскіх, маральных і эстэтычных поглядаў і ідэалаў.

Для далучэння дзяцей да вытокаў народнай культуры выдзелены наступныя напрамкі работы:

– пашырэнне і паглыбленне ведаў дзяцей аб нашай Радзіме;

– фарміраванне агульнага ўяўлення аб культуры беларускага народа;

– азнаямленне з беларускімі звычаямі і традыцыямі, з народнай творчасцю;

– далучэнне навучэнцаў да вытокаў і святочнага традыцыйнага беларускага фальклору.

Існуюць розныя шляхі фарміравання духоўна-маральных якасцяў у навучэнцаў. На любым занятку, будзь то харэаграфічнае мастацтва ці дэкаратыўна-прыкладная творчасць, вакальнае выканальніцтва і г.д., абавязкова праяўляецца выхаваўчы характар навучання.

Так, выкарыстанне этнакультурных традыцый станоўча зарэкамендавала сябе на музычных занятках, дзе дзеці слухаюць народную музыку, спяваюць народныя песні. Практыка даказала, што музыка валодае асаблівай сілай уздзеяння на пачуцці, а эмацыянальны настрой выклікае ў дзяцей цікавасць да нацыянальнай культуры.

Беларуская народная музычная творчасць увасабляе ў сабе стагоддзямі назапашаныя вечныя каштоўнасці, музычны вопыт і нацыянальна своеасаблівую музычную мову беларускага народа.

Беларускі музычны фальклор – арганічная частка музычнай культуры ў цэлым. Ён валодае сацыяльнай функцыяй і спрыяе комплекснаму ўздзеянню на асобу – духоўнаму, маральнаму, эстэтычнаму, бо адлюстроўвае агульначалавечыя эмоцыі і маральныя каштоўнасці. З іншага боку, дадзенае мастацтва нясе ў сабе нацыянальную своеасаблівасць, якая выяўляецца ў нацыянальным характары, мове, этнічнай самасвядомасці, нацыянальным светапоглядзе, а таксама ў своеасаблівай музычнай мове, засваенне якой будзе спрыяць назапашванню ў дзяцей нацыянальна своеасаблівых інтанацыйна-слыхавых уяўленняў.

Музыка кампазітараў Беларусі цесна звязана з народнай музычнай творчасцю; яна злучае ў сабе як творчыя прынцыпы сусветнай класічнай музыкі, так і прынцыпы развіцця народнага меласа, нараджаючы новую інтанацыйна-вобразную сістэму музычнага мыслення. Засваенне прафесійнага музычнага мастацтва выхаванцамі спрыяе пашырэнню агульнага і музычнага кругагляду, успрыманню нацыянальна своеасаблівай мовы скрозь прызму сучаснага музычнага мастацтва.

Дадзеная дзейнасць накіравана на тое, каб пазнаёміць дзяцей з беларускім музычным мастацтвам, прывіць любоў і цікавасць да яго, сфарміраваць пачуццё павагі да беларускай музычнай культуры.

Асаблівае значэнне мае правільна падабраны праграмны музычны матэрыял. Народныя песні спрыяюць узнікненню цікавасці да роднай культуры, адраджэнню этнічнай самасвядомасці. Яны блізкія і зразумелыя дзецям. Гэтаму спрыяюць прастата форм, натуральнасць і яркасць пачуццяў, закладзеных у творах народна-песеннай творчасці. Творы музычнага фальклору, асабліва архаічныя жанры, складваліся без дапамогі музычнага інструмента, таму вельмі зручныя для выканання дзецьмі. Паўторнасць фраз спрыяе запамінанню. Запеў у песні дазваляе дзецям адпачыць у той час, калі спявае запявала, што спрыяе гігіене і ахове дзіцячага голасу.

Варта адзначыць, што дзецям найбольш даступныя для выканання каляндарна-абрадавыя песні-заклічкі, калядкі, а таксама гульнёвыя, жартоўныя, карагодныя песні. Творы дзіцячага музычнага фальклору – прымаўкі, пацешкі, пястушкі – больш падобныя не на песні, а на творчыя заданні-практыкаванні, накіраваныя на развіццё дыкцыі, рытмічнага пачуцця.

Галоўная іх мэта – у ходзе пацешнай гульні падрыхтаваць дзіця да пазнання навакольнага свету. Такія творы дзіцячага музычнага фальклору з'яўляюцца разумовай і фізічнай трэніроўкай, пачаткам маральнага і духоўнага выхавання. Нярэдка творы дзіцячага фальклору ўяўляюць сабой жартоўныя перайманні сур'ёзных спраў дарослых, у ходзе асваення якіх дзеці праходзяць як бы псіхалагічную падрыхтоўку да вытворча-гаспадарчай дзейнасці.

Асаблівае значэнне маюць калыханкі, выкананне якіх дасць дзецям магчымасць рэалізаваць свае добрыя пачуцці ў мастацкім вобразе.

Вывучэнне беларускай культуры не толькі спрыяе развіццю асобы дзіцяці, але і фарміруе навыкі міжасобасных зносін.

Такім чынам, уключэнне каштоўнасцяў і традыцый народнай культуры беларускага краю ў працэс навучання дзяцей дае магчымасць вырашаць многія выхаваўчыя мэты і задачы:

– развіццё пазнавальнага, камунікатыўнага, маральнага, фізічнага, эстэтычнага патэнцыялаў асобы вучняў;

– выхаванне асобы дзіцяці, якая ведае гісторыю і традыцыі свайго народа;

– выкарыстанне ў працы разнастайных даступных і цікавых для дзецей формаў і метадаў працы.

Педагагічныя ўмовы, заснаваныя на ўкараненні прагрэсіўных прынцыпаў этнапедагогікі, каштоўныя тым, што яны спрыяюць духоўна-маральнаму выхаванню навучэнцаў. Гэта дасягаецца толькі за кошт сістэмнага, планамернага і мэтанакіраванага ўключэння ў структуру заняткаў і мерапрыемстваў элементаў народнай культуры, правільнага выбару метадаў і сродкаў іх арганізацыі [1–10].

**Заключэнне.** Этнакультуралагічны падыход да выхавання, які стаў прыярытэтным у сучасных умовах, актуалізуе праблемы вывучэння народнай педагогікі. Выкарыстанне нацыянальна-культурных каштоўнасцяў у выхаванні дзяцей з'яўляецца найбольш эфектыўнай умовай духоўна-маральнага дабрабыту любой нацыі. Выхаванне навучэнцаў мае патрэбу ў пастаянным удасканаленні і ўзбагачэнні яго метадаў шматвяковым народным вопытам. Нельга забываць, што вытокам педагогікі з'яўляецца народны пачатак.

Творчае ўжыванне і развіццё гістарычна складзеных народных выхаваўчых традыцый павінна стаць адным з асноўных напрамкаў духоўна-маральнага развіцця дзяцей.

ЛІТАРАТУРА

1. Аляхновіч, А.М. Беларускі дзіцячы фальклор / А.М. Аляхновіч. – Мінск: Беларусь, 1994. – 270 с.
2. Беларусы: у 8 т. – Мінск: Беларус. навука, 1995–2005. – Т. 5: Сям'я / В.К. Бандарчык [і інш.], 2001. – 375 с.
3. Традыцыйная мастацкая культура беларусаў: у 6 т. / склад. Т.Б. Варфаламеева. – Мінск: Беларус. навука, 2004. – Т. 2: Віцебскае Падзвінне / [Т.Б. Варфаламеева і інш.], 2004. – 910 с.
4. Грымаць, А.А. Народная педагогіка беларусаў / А.А. Грымаць. – Мінск: Выдавец У.М. Скакун, 1999. – 396 с.
5. Крук, І.І. Сімволіка беларускай народнай культуры / І.І. Крук. – 2-е выд. – Мінск: Ураджай, 2001. – 334 с.
6. Ліцьвінка, В.Д. Святы і абрады беларусаў / В.Д. Ліцьвінка. – Мінск: Беларусь, 1997. – 188 с.
7. Лобач, У.А. Этнаграфія Беларусі: вучэб.-метад. комплекс / У.А. Лобач. – Наваполацк: Полац. дзярж. ун-т, 2006. – 328 с.
8. Лозка, А.Ю. Беларускі народны каляндар / А.Ю. Лозка. – 2-е выд., перапрац. і дап. – Мінск: Полымя, 2002. – 238 с.
9. Сівурава, Л.П. Фестывалі фальклорныя / Л.П. Сівурава // Беларускі фальклор: энцыкл.: у 2 т. / Л.П. Сівурава. – Мінск: БелЭн, 2006. – Т. 2: Лабараторыя традыцыйнага мастацтва. – 677 с.
10. Сысоў, У.М. З крыніц спрадвечных / У.М. Сысоў. – Мінск: Выш. шк., 1997. – 415 с.